# ГОНАР НАШАГА ЎНІВЕРСІТЭТА



Па традыцыі на пачатку лютага былі падведзены вынікі конкурсу «Чалавек года Віцебшчыны». Імёны лаўрэатаў у розных сферах – ад прамысловасці і сельскай гаспадаркі да адукацыі і культуры – былі названы падчас цырымоніі ўручэння дыпломаў, якая праходзіла ў ДУ «Цэнтр культуры ”Віцебск“».

Прыемна, што ў ліку пераможцаў – прадстаўнікі нашага ўніверсітэта. Адзін з іх – доктар фізіка-матэматычных навук, прафесар, загадчык кафедры алгебры і методыкі выкладання матэматыкі М.Ц. Вараб'ёў (намінацыя «Адукацыя»).

Мікалай Цімафеевіч ужо больш за сорак гадоў працуе ў ВДУ імя П.М. Машэрава, а з 1997 года ўзначальвае кафедру. Узнагароджаны нагрудным знакам «Выдатнік адукацыі», медалём Францыска Скарыны, шматлікімі абласнымі і рэспубліканскімі граматамі.

За гэты час прафесар падрыхтаваў не адно пакаленне высокакваліфікаваных спецыялістаў – настаўнікаў, праграмістаў, вучоных... Працуюць разам з бацькам і сыны – Мікалай Мікалаевіч і Сяргей Мікалаевіч, якія таксама выкладаюць у нашым універсітэце.

У намінацыі «Культура, мастацтва, духоўнае адраджэнне» ўзнагароджаны яшчэ адзін машэравец – кандыдат мастацтвазнаўства, дацэнт кафедры выяўленчага мастацтва, сябра Беларускага саюза мастакоў, ганаровы прафесар Даўгаўпілскага ўніверсітэта М.Л. Цыбульскі.

Міхась Леанідавіч прымае актыўны ўдзел у культурным жыцці Віцебшчыны, курыруе правядзенне шматлікіх выстаў, мастацкіх акцый, навукова-творчых сімпозіумаў, навуковых чытанняў, творчых праектаў з удзелам мастакоў з розных краін. Піша артыкулы, прысвечаныя тэме мастацтва, для перыядычнага друку, навуковых і энцыклапедычных выданняў, у тым ліку для «Беларускай энцыклапеды». Нельга не адзначыць, што большасць аўтарскіх праектаў і публікацый лаўрэата прысвечана даследаванню і папулярызацыі творчасці прадстаўнікоў Віцебскай мастацкай школы. Сам жа Міхась Леанідавіч працуе ў тэхніцы алейнага і гуашавага жывапісу. Яго работы можна пабачыць не толькі ў музеях Беларусі, але і за межамі нашай рэспублікі: у Расіі, Польшчы, Латвіі, Украіне.

Лаўрэатам у намінацыі «Культура, мастацтва, духоўнае адраджэнне» была названа і Алена Ігараўна Скорынава, настаўніца вышэйшай катэгорыі Шумілінскай дзіцячай школы мастацтваў, студэнтка завочнага аддзялення педагагічнага факультэта нашага ўніверсітэта (спецыяльнасць «Музычнае мастацтва, рытміка і харэаграфія»).

Вучні Алены Ігараўны прымаюць удзел у шматлікіх музычных конкурсах і фестывалях, у тым ліку і міжнародных, на якіх становяцца дыпламантамі і лаўрэатамі. Шмат узнагарод і ў самой Алены Скорынавай, бо яна не толькі навучае здольных да музыкі вучняў, але і іграе ў народным аркестры настаўнікаў дзіцячай школы мастацтваў, а таксама ў сямейным ансамблі «Чароўныя музыкі» з мужам і дзецьмі. Ансамбль Скорынавых выступае на многіх культурных мерапрыемствах горада і вобласці, удзельнічае ў розных конкурсах. Да прыкладу, у 2006 годзе сямейны ансамбль быў прызнаны дыпламантам абласнога агляду-конкурсу сямейнай творчасці «Сям'я Прыдзвіння», у 2012 годзе – пераможцам фіналу абласнога агляду-конкурсу «Лепшая мнагадзетная сям'я Віцебшчыны».

У хуткім часе бігборды з партрэтамі лаўрэатаў конкурсу можна будзе ўбачыць на вуліцах горада.

**Алеся ДУБРОЎСКАЯ.**

**На здымку:** *(злева направа)* М.Л. Цыбульскі, А.І. Скорынава і М.Ц. Вараб'ёў з дыпломамі.

**Фота Настассі Лазебнай.**